Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў”

ЗАЦВЯРДЖАЮ

Прарэктар па вучэбнай рабоце БДУКМ

________________С.Л. Шпарло

“20” ____10______2022 г.

Рэгістрацыйны № ВД 440 /эвуч.

**СПЕЦІНСТРУМЕНТ**

Вучэбная праграма установы вышэйшай адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці
*1-16 01 06 Духавыя інструменты (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці*
*1-16 01 01-11 Духавыяінструменты (народныя)*

2022

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі I ступені па спецыяльнасці 1-16 01 06 Духавыя інструменты (па напрамках), зацверджанага пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 12 красавіка 2022 г. № 78, вучэбнага плана БДУКМ па напрамку спецыяльнасці

**СКЛАДАЛЬНІК:**

*І.А. Мангушаў,* прафесар кафедры духавой музыкі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», дацэнт.

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*В.А. Немцава,* народна-інструментальнай творчасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт;
*А.Я. Крамко,* дырыжор Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра Рэспублікі Беларусь імя І. Жыновіча, заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь, дацэнт;

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай* духовой музыкіўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 8 ад 21.04.2022);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 5 ад 15.06.2022)

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна “Спецінструмент” з’яўляецца вызначальнай у працэсе падрыхтоўкі выканаўцаў напрамку спецыяльнасці 1-16 01 06-11 “Духавыя інструменты (народныя)”, спрыяе фарміраванню прафесійных навыкаў студэнтаў, усебаковаму развіццю творчай індывідуальнасці.

Вучэбная дысцыпліна “Спецінструмент” ” звязана з такімі вучэбнымі дысцыплінамі як: “Сальфеджыо”, “Гармонія”, “Аналіз музычных форм і паліфонія”, “Народна-інструментальная музычная культура Беларусі”, “Сусветная і нацыянальная гісторыя, тэлорыя выканальніцтва на народных, духавых і ударных інструментах”, “Методыка работы з фальклорным калектывам”, “Народна-аркестравае выканальніцтва”, “Народна-ансамблевае выканальніцтва” і інш.

*Мэта вучэбнай дысцыпліны* – падрыхтоўка прафесійных выканаўцаў на народных духавых музычных інструментах, якія здольны займацца самастойнай творча-выканальніцай дзейнасцю як канцэртны выканаўца, як артыст ансамбля ці аркестра і як выкладчык, які забяспечыць навучальны працэс па падрыхтоўке адпаведных выканаўцаў у пачатковых, сярэднеспецыяльных і вышэйшых установах культуры і мастацтваў, а таксама выканаўцаў у сферы аматарскай творчасці.

*Задачы* вучэбнай дысцыпліны развіць адпаведныя творча-выканальніцкія навыкі ў асабістай мастацка-прафесійнай дзейнасці, працягваць развіццё народных традыцый;

1) састаўляць планы самастойнай работы над інструктыўным матэрыялам (практыкаванні, гамы, эцюды, творы);

2) самастойна вызначаць ансаблевыя ці аркестравыя цяжкасці і ажыццявіць адпаведную работу па іх дакладнаму выкананню;

3) дакладна ажыццяўляць настройку таго ці іншага музычнага інструмента з дапамогай цюнара ці фартэпіяна;

4) ажыццяўляць неардынарныя творчыя эксперыменты і пошукі найбольш эфектыйных канцэртных увасабленняў народнай традыцыйнай музыкі і сучасных аўтарскіх твораў народна-інструментальнага мастацтва;

5) спрыяць сацыякультурнаму прэстыжу народна-інструметальнай спадчыны Беларусі.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны “Спецінструмент” студэнт павінен *ведаць:*

– аб класіфікацыі, функцыянальных і мастацка-выканальніцкіх асаблівасцях асноўных беларускіх народных духавых інструментаў (тыпалогія; выразна-тэхнічныя магчымасці; строй; дыяпазон і г.д.);

– аб сутнасці сольнага выканаўства (*solo*; *solo*у суправаджэнні фартэпіяна; *solo* у суправаджэнні інструментальнага ансамбля ці капэлы беларускіх народных духавых інструментаў );

– псіхолага-педагагічныя і арганізацыйна-метадычныя асаблівасці арганізацыі работы па засваенню беларускіх народных духавых інструментаў (выкарыстанне неабходных дыдакітычных прынцыпаў у працэсе заняткаў на музычным інструменте; вызначэнне асноўных кірункаў

занятkaў, іх змест і адпаведны аб'ёмзаданняў; выкарыстанне неабходных тэхнічных сродкаў і г.д.);

– Паслядоўнасць этапаў работы над музычнымі творамі (музычна-выканальніцкі аналіз вывучаемых твораў; адпаведны графік вывучэння найбольш складаных фрагментаў выконваемых твораў; асноўные этапы, паслядоўнасць работы над асабістым творам ці іх камбінацыямі).

– аб выкананні варыянтаў, трактовак, інтэрпрытацый, рэдакцый, музычных твораў (параўнальны аналіз музычнага матэрыяла).

– аб функцыянальных мастацка-выразных магчымасцях свістковых, язычковых і амбушурных беларускіх народных духавых інструментаў (solo, кантрапункт, музычная арнаментыка і г.д.).

– аб сацыякультурных аспектах і асаблівасцях арганізацыі канцэртна-выканальніцкай дзейнасці выканаўцаў на беларускіх народных духавых інструментах (трансліраванне лепшых узораў музычнай спадчыны; удзел у святах, фестывалях, канцэртах беларускага нацыянальнага мастацтва; сцэнічная культура выканаўцы і скасаванне такіх негатыўных якасцей, як сцэнічнае хваляванне, эмацыянальная статычнасць і г.д.).

*умець:*

– Выкананне вызначаных абавязковых ранішніх практыванняў на аснове кантрастнага супастаўлення (кантылена і складаныя тэхнічныя камбінацыі). Вырашэнне праблем гукаутварэння, звязаных са спецыфікай кожнага з традыцыйных народных духавых інструментаў. Папярэдняя падрахтоўка выканальніцкага апарату да аўдыторных заняткаў з выкладчыкам і канцэртмайстрам. Дакладнае выкананне абертонаў.

– Карэктура інтанавання ў працэсе ігры з канцэртмайстрам.

– Збалансаванне дынаміка-акустычнага гучання ў працэсе сумеснага выканання твора ў суправаджэнні з фартэпіяна.

– Тэхналогія выканання штрыхоў, прыёмаў і манеры гучання ў залежнасці ад жанравай накіраванасці твораў. Супастаўленне розных штрыхавых камбінацый з мэтай іх дакладнага выканання ці кантраснага эффекта.

– Дакладнае выкананне метра-рытмічнай структуры (інструктыўны матэрыял, вучэбна-педагагічны ці канцэртны рэпертуар);

– Вызначэнне спецыфікі пабудовы і выканання фразіроўкі, а таксама матываў, кантрапункту рэчытаціву;

– Расшыфроўка і выкананне музычнай арнаментыкі (трэлі, групета, мардэнт і г.д.);

– Выкананне незнаемых музычных твораў рознай ступені складанасці і формаў у працэсе чытання нот з ліста.

*валодаць:*

– храматычнай дудкай – сапрана in C і абавязкова шэрагам дадатковых духавых інструментаў у наступных групах:

– свістковыя (разнастайнасці дудак: сапрана in C, альт in G, тэнар in F, бас in C, паршнёвая дудка, парныя дудкі; акарына);

– язычковыя (жалейка дыятанічная і храматычная; дуда in D, in G; саломка);

– амбушурныя (драўляная труба).

Акрамя гэтага, студэнты падчас заняткаў па вучэбнай дысцыпліне “Спецінструмент” павінны азнаёміцца і з такімі эпізадычнымі духавымі народнымі інструментамі беларусаў, як чаротка, рог, свісцёлкі, дудкі з натуральнымі страямі і г.д.

Засваенне вучэбнай дысцыпліны “Спецінструмент” павінна забяспечыць фарміраванне базавых прафесійных кампетэнцый БПК-6 Выкарыстоўваць сродкі мастацкай выразнасці для рэалізацыі творчых задум.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Спецінструмент” усяго адведзена 580 гадзін, з якіх 272 гадзіны аудыторныя (індывідуальныя) заняткі.

Рэкамнедаваныя формы кантролю ведаў студэнтаў – залікі, экзамены.

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛА

## Уводзіны

Сутнасць і мэта вучэбнай дысцыпліны. Змест і задачы вучэбнай дысцыпліны. Структура вучэбнай дысцыпліны: праблемна-тэматычныя раздзелы.

Формы бягучага і выніковага кантроля і віды іспытаў па выяўленню ступені засваення ведаў студэнтамі.

Патрабаванні па вывучэнню матэрыялаў вучэбнай дысцыпліны з улікам розных форм кантроля ведаў і іспытаў.

## Тэма 1. Асаблівасці засваення беларускіх народных музычных духавых інструментаў

Сувязь вучэбнай дысцыпліны з іншымі дысцыплінамі.

Класіфікацыя тыпавога традыцыйнага і сучаснага мадыфіцыраванага інструментарыя, яго функцыі, мастацка-выканальніцкія асаблівасці.

Спецыфіка уключэння народных духавых інструментаў ў сучасную выканальніцкую практыку (сольнае выканаўства; ансамблевае выканаўства; аркестравае выканаўства).

Класіфікацыя, функцыянальныя і мастацка-выканальніцкія асаблівасці тыпавога традыцыйнага і сучаснага мадыфіцыраванага інструментарыя.

## Тэма 2. Сутнасць, спецыфіка і асаблівасці развіцця выканальніцкага мастацтва на беларускіх народных музычных інструментах

Сутнасць выканальніцкага мастацтва на беларускіх народных музычных інструментах і яго параўнальны аналіз з адпаведнымі кірункамі інструментальнага выканаўства.

Спецыфічныя якасці выканаўцы на беларускіх народных музычных інструментах.

Асновы музіцыравання на беларускіх народных музычных інструментах :

1) сольнага;

2) сумеснага (у складзе камерна-інструментальнага ансамбля з фартэпіяна, ансамбля ці аркестра народных інструментаў).

Змест заняткаў выкладчыкаў з выканаўцамі на розных народных духавых інструментах. Змест самастойных заняткаў студэнтаў па выкананні аб'ёму заданняў з мэтай развіцця выканальніцкіх навыкаў на розных народных духавых музычных інструментах.

Шляхі развіцця навыкаў сумеснага музіцыравання і фарміравання мастацкага густу ў складзе камерна-інструментальнага ансамбля (беларускі народны духавы музычны інструмент - фартэпіяна).

## Тэма 3. Сутнасць функцыянальных асноў гукаўтварэння і гуказдабывання.

Змест, сутнасць і паняцце тэрміна *"Выканальніцкі апарат"*. Фарміраванне прафесійнага амбушура. Тэхніка выканальніцкага дыхання (фізічныя і псіхалагічныя аспекты). Асноўныя тыпы выканальніцкага дыхання, з улікам дынаміка-акустычных асаблівасцей беларускіх народных духавых інструментаў.

Акустычна-дынамічныя, тэмбрава-каларыстычныя, тэхнічныя асаблівасці гуказдабывання і гукаўтварэння. Выканальніцкая пастаноўка, становішча рук і пальцаў выканаўцы.

## Тэма 4. Арганізацыйна-метадычныя і псіхолага-педагагічныя падыходы у рабоце з выканаўцамі на беларускіх народных духавых інструментах

Асаблівасці зместу аудыторных заняткаў і іх асноўныя этапы.

Асноўныя тэматычныя кірункі, жанры і прынцыпы фарміравання вучэбна-педагагічнага і канцэртна-выканальніцкага рэпертуару з улікам узроўню індывідуальнай падрыхоўкі выканаўцаў і іх творчых здольнасцей.

Выкарыстанне дыдактычных і псіхалагічных прынцыпаў у працэсе заняткаў з выканаўцамі набеларускіх народных духавых інструментах (прынцып інтарэсу, даступнасць, узровень кваліфікацыйнай падрыхтоўка выканаўцы, воля выканаўцы, псіхалагічная сумяшчальнасць выканаўцы з канцэртмайстрам і выкладчыкам у час аўдыторных заняткаў, шляхі стварэння паспяховага псіхолага-маральнага клімату у час правядзення заняткаў).

## Тэма 5. Засваенне штрыхоў, традыцыйных і спецыфічных прыёмаў гуказдабывання на беларускіх народных духавых інструментах

Паняцце "штрых", яго сутнасць і роля у выканальніцкім музычным мастацтве. Разнавіднасці штрыхоў, якія выкарыстоўваюца пры ігре на беларускіх народных духавых інструментах. Умоўныя абазначэнні асноўных штрыхоў, развіццё навыкаў іх выканання. Штрыхі як сродак артыкуляцыі.

Элементы і стадыі выканання штрыхоў: 1) пачатак (атака); 2) вядзенне ; 3) заканчэнне гуку.

Асаблівасці і прыёмы гуказдабывання пры выкананні штрыхоў. Сутнасць узаемасувязі гуказдабывання і выканання штрыхоў.

Спецыфічныя штрыхі і прыёмы гуказдабывання, распаўсюджаныя ў народна-інструментальнай выканаўчай практыцы.

## Тэма 6. Сістэмы настройкі беларускіх народных духавых інструментаў

Асаблівасці інтанавання пры выкананні на беларускіх народных духавых інструментах (канструктыўныя і тэхналагічныя недахопы і шляхі іх пераадольвання). Узаемаабумоўленасць дакладнага інтанавання і арганалагічных асаблівасцей.

Меладычная, гарманічная настройка інструментаў і іх спецыфіка у працэсе выканання *solo*, ў складзе камерна-інструментальнага ансамбля з фартэпіяна, ансамбля ці аркестра народных інструментаў.

Выкарыстанне розных спосабаў настройкі беларускіх народных духавых інструментаў (*пры дапамозе тюнэра; пры дапамозе слыху; па камертону; па гучанню другога інструмента* – фартепіяна, беларускага народнага духавога інструмента).

Асаблівасці карэкціроўкі інтанавання ў працэсе сольнага ці сумеснага выканаўства: 1) прынцып ладатанальнага цягацення; 2) выкарыстанне дадатковай аплікатуры; 3) змяненне параметраў апертуры і амбушура; 4) карэкцыя экспрэсіі выканальніцкага дыхання.

## Тэма 7. Фразіроўка пры ігре на беларускіх народных духавых інструментах

Паняцце “фразіроўка”, яе сутнасць, значнасць і роля ў выканальніцкім музычным мастацтве. Асноўныя элементы фразіроўкіпры ігре на беларускіх народных духавых інструментах:

– матыў;
– перыяд;
– фраза;
– кантрапункт.

Фразіроўка як сродак выразнасці ў адпаведнасці са стылістычнымі асаблівасцямі твораў (арыгінальныя творы ці іх інструментоўкі).

Спеціфіка дакладнасці фразіроўкі пры ігре на беларускіх народных духавых інструментах з улікам іх дынаміка-акустычных, этнаарганалігічных і канструктыўна-мадіфікаваных асаблівасцей.

## Тэма 8. Праблемы дынаміка-акустычнага балансу пры выкананні на беларускіх народных духавых інструментах

Дынаміка як мастацка-выразны сродак музычнага мастацтва і яе спецыфіка з улікам гучання беларускіх народных духавых інструментаўу *solo*, ў складзе камерна-інструментальнага ансамбля з фартэпіяна, ансамбля ці аркестра народных інструментаў.

Паняцце аб рэльефе, фоне, аб’ёме і балансу гучання на беларускіх народных духавых інструментаў. Шляхі дасягнення аб’ёму прасторавага гучання беларускіх народных духавых інструментаў у *solo*, ў складзе камерна-інструментальнага ансамбля з фартэпіяна, ансамбля ці аркестра народных інструментаў.

Развіццё выканальніцкіх навыкаў для дасягнення збалансаванага гучанняў складзе камерна-інструментальнага ансамбля з фартэпіяна, ансамбля ці аркестра народных інструментаў.

Прынцыпы кантрасту дынамікі гучання на беларускіх народных духавых інструментаў.

Узаемасувязь дынамікі і музычнай фактуры ў працэсе выканання ў складзе камерна-інструментальнага ансамбля з фартэпіяна, ансамбля ці аркестра народных інструментаў.

## Тэма 9. Асаблівасці работы над метрарытмічнымі цяжкасцямі пры выкананні на беларускіх народных духавых інструментаў

Паняцці “метр” і “рытм”, іх сутнасць у музычным мастацтве.

Метрарытм як адзін з галоўных элементаў і мастацкіх сродкаў у музыкі.

Формаўтваральнае значэнне рытму, вывучэнне тыпавых і розных іншых варыянтаў метрарытмічных асаблівасцей лепшых узораў беларускай народна-інструментальрнай спадчыны (арыгінальныя творы, апрацоўкі народна-песенных і танцевальных мелодый).

Развіццё навыкаў выканання розных метрарытмічных камбінацый на беларускіх народных духавых інструментах у *solo*, ў складзе камерна-інструментальнага ансамбля з фартэпіяна, ансамбля ці аркестра народных

інструментаў (музычныя практыкаванні, гамы, эцюды, вучэбна-педагагічны і канцэртны рэпертуар).

Дасягненне дакладнасці метрарытму ў калектыўнай ігры пры выкананні твораў у складзе камерна-інструментальнага ансамбля з фартэпіяна, ансамбля ці аркестра народных інструментаў.

**Тэма 10. Методыка развіцця навыкаў чытання нот з лістапры ігре на беларускіх народных духавых інструментах**

Навыкі чытання нот з ліста і іх значнасць у падрыхтоўкі выканаўцаў набеларускіх народных духавых інструментах.

Развіццё выканальніцкіх навыкаў інтэнсіўнага засваення музычнага матэрыялу з мэтай пашырэння і засваення вучэбна-педагагічнага і канцэртнага рэпертуару.

Спосабы развіцця навыкаў чытання нот з ліста.

Актывізацыя і развіццё музыкальных здольнасцей у працэсе чытання нотнага тэксту ў складзе камерна-інструментальнага ансамбля з фартэпіяна, ансамбля ці аркестра народных інструментаў.

**Тэма 11. Асаблівасці вывучэння вучэбна-педагагічных, канцэртных музычных твораў для беларускіх народных духавых інструментаў**

Дэталёвы музычна-выканальніцкі аналіз асаблівасцей вывучаемага твора і задача па стварэнні адпаведных музычных вобразаў у працэсе выканаўства на народных духавых інструментах. Работа над асноўнымі эпізодамі музычнага твора (развіццё навыкаў сумеснага выканаўства з улікам тэхнічных ансамблевых цяжкасцей ў складзе камерна-інструментальнага ансамбля з фартэпіяна, ансамбля ці аркестра народных інструментаў; дынамічны баланс; штрыхі; фразіроўка; выкананне дробнай тэхнікі; інтанацыя і інш.). Шляхі вырашэння музычна-выканальніцкіх задач па стварэнні музычных вобразаў у працэсе канчатковага этапу выканаўства на беларускіх народных духавых інструментаў ў адпаведнасці з мастацка-эстэтычным патрабаваннем твораў (арыгінал, інструментоўка і г.д.).

Асаблівасці выканання эстрадных і джазавых твораў з улікам спецыфічнай манеры і стылю выканання. Тэхнічныя сродкі ў працэсе вывучэння жанрава-стылявых асаблівасцей (выкарыстанне сінтэзатараў і камп'ютэрная апрацоўка музычнага матэрыялу з мэтай стварэння фанаграм ("-1"). Дасягненне мастацкіх эфектаў шляхам злучэння беларускіх народных духавых інструментаў і сучаснага музычнага інструментарыя (фартэпіяна; аркестравыя духавыя інструменты ў складзе ансамбля ці аркестра; эпізадычныя інструменты; электрафікаваныя сучасныя музычныя інструменты -разнавіднасці клавішных інструментаў, бас-гітара; ударная ўстаноўка і перкашын і інш.).

**Тэма 12. Развіццё навыкаў выканання на слых пры ігры на беларускіх народных духавых інструментах**

Тэхналогія падбору па слыху традыцыйных народных мелодый беларускай музычнай спадчыны. Тэхналогія падбору па слыху кантрапункта ў традыцыйных народных мелодый беларускай музычнай спадчыны.

Тэхналогія падбору па слыху асноўнай мелодыі з спалучэннем другога голасмузычнай арнаментыкі ў традыцыйных народных мелодый беларускай музычнай спадчыны. Развіццё імправізацыйна-варыяцыйных спосабаў выканання на аснове традыцыйных народных мелодый беларускай музычнай спадчыны. Выкарыстанне спецыфічных прыёмаў і штрыхоў народнага выканаўства ў працэсе падбору па слыху традыцыйных народных мелодый, іх другіх галасоў, кантрапункта, музычнай арнаментыкі, імправізацыйна-варыяцыйных спосабаў выканання на аснове традыцыйных народных мелодый беларускай музычнай спадчыны.

### Тэма 13. Змест музычных твораў для беларускіх народных духавых інструментаў і ўвасабленне варыянтнай шматлікасці іх трактовак

Выкарыстанне асноўных сродкаў музычнай выразнасці ў працэсе стварэння мастацкага вобраза. Інтэрпрэтацыя як тлумачэнне аўтарскіх тэкстаў. Асаблівасці выпрацоўкі пэўнай мастацкай канцэпцыі і пошуку выразных магчымасцей у працэсеўвасаблення варыянтнай шматлікасці трактовак музычных твораў для беларускіх народных духавых інструментаў. Суадносіны кампазітарскага і выканальніцкага пачаткаў, шматлікасць трактовак гэтага спалучэння у працесе выканання на беларускіх народных духавых інструментах.

Вывучэнне асноў жанрава-стылявых кірункаў. Асаблівасці выканання старадаўняй музыкі і яе інтэрпрэтацыя. Расшыфроўка знакаў скарачэння нотнага запісу і менізматыкі.

Асаблівасці выканання эстрадных і джазавых твораў з улікам спецыфічнай манеры і стылю выканання. Тэхнічныя сродкі ў працэсе вывучэння жанрава-стылявых асаблівасцей (выкарыстанне сінтэзатараў і камп'ютэрная апрацоўка музычнага матэрыялу з мэтай стварэння фанаграм ("-1"). Дасягненне мастацкіх эфектаў шляхам злучэння беларускіх народных духавых інструментаў і сучаснага музычнага інструментарыя (аркестравыя духавыя інструменты ў складзе ансамбля ці аркестра; эпізадычныя інструменты; электрафікаваныя сучасныя музычныя інструменты (разнавіднасці клавішных інструментаў, бас-гітара); ударная ўстаноўка і перкашын і інш.).

### Тэма 14. Асаблівасці падрыхтоўкі да канцэртна-выканальніцкай дзейнасці выканаўцаў на беларускіх народных духавых інструментаў

Развіццё выканальніцкіх навыкаў падчас падрыхтоўкі да канцэртна-выканальніцкай дзейнасці з мэтай фарміравання мастацкага густу выканаўцы і эстэтычнага выхавання слухачоў. Шляхі ўдасканалення прафесійнага майстэрства. Сцэнічна-псіхалагічная падрыхтоўка выканаўцаў на народных духавых інструментаў для ўдзелу у значных сацыякультурных мерапрыемствах. Арганізацыйна-творчыя пытанні падрыхтоўкі і правядзення канцэртнага выступлення. Эмацыянальна-псіхалагічная падрыхтоўка выканаўцаў (уменне максімальна сабрацца ў адказны момант публічнага выступлення; аўтатрэнінг; вопыт папярэдняй канцэртнай дзейнасці). Жанрава-стылявыя і сацыяльна-ўзроставыя ўмовы (дыферэнцыраваны падыход у складанні выконваемай канцэртнай праграмы, разлічанай на розны

музычны густ той ці іншай сацыяльнай групы). Эстэтыка-сцэнічныя ўмовы (антураж, сцэнічны выгляд і імідж у адпаведнасці са стылем і эпохай выконваемых твораў). Пытанні акустыкі і тэхнічна-інструментальнага забеспячэння выступлення ў канцэртнай зале або на пленэры.

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| № п/п | Назва раздзелу, тэмы | Колькасць аудыторных гадзін | УСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|
| | | Індывідуальныя | | |
| | Уводзіны | 1 | | |
| 1. | Асаблівасці засваення беларускіх народных музычных духавых інструментаў | 1 | | |
| 2. | Сутнасць, спецыфіка і асаблівасці развіцця выканальніцкага мастацтва на беларускіх народных музычных інструментах | 16 | 2 | Технический зачет |
| 3. | Сутнасць функцыянальных асноў гукаўтварэння і гуказдабывання | 18 | 4 | Технический зачет |
| 4. | Арганізацыйна-метадычныя і псіхолага-педагагічныя падыходы ў рабоце з выканаўцамі на беларускіх народных духавых інструментах | 16 | 2 | Технический зачет |
| 5. | Засваенне штрыхоў, традыцыйных і спецыфічных прыёмаў гуказдабывання на беларускіх народных духавых інструментах | 34 | 10 | Академический концерт |
| 6. | Сістэма настройкі беларускіх народных духавых інструментаў у працэсе выканання | 10 | 2 | Технический зачет |
| 7. | Фразіроўка пры ігры на беларускіх народных духавых інструментах | 30 | 8 | Технический зачет |
| 8. | Праблема дынаміка-акустычнага балансу пры выкананні на беларускіх народных духавых інструментах | 14 | 2 | Технический зачет |
| 9. | Асаблівасці работы над метрарытмічнымі цяжкасцямі пры выкананні на беларускіх народных духавых інструментах | 14 | 2 | Технический зачет |
| 10. | Методыка развіцця навыкаў чытання нот з ліста пры ігре на беларускіх народных духавых інструментах | 14 | 6 | Академический концерт |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 11. | Асаблівасці вывучэння вучэбна-педагагічных, канцэртных музычных твораў для беларускіх народных духавых інструментаў | 12 | 4 | Технический зачет |
| 12. | Развіццё навыкаў выканання на слых пры ігры на беларускіх народных духавых інструментах | 6 | 8 | Технический зачет |
| 13. | Змест музычных твораў для беларускіх народных духавых інструментаў і ўвасабленне варыянтнай шматлікасці іх трактовак | 16 | 2 | Технический зачет |
| 14. | Асаблівасці падрыхтоўцы да канцэртна-выканальніцкай дзейнасці выканаўцаў на беларускіх народных духавых інструментах | 16 | 2 | Технический зачет |
| | **УСЯГО 272** | **218** | **54** | |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## *Асноўная літаратура*

1. Байбикова, Г. В. Основы музыкально-педагогического общения : учеб.-метод. пособие для студентов высших учебных заведений, обучающихся по направлению подготовки "Музыкально-инструментальное искусство" / Г. В. Байбикова. - 3-е изд., стер. - Санкт-Петербург ; Москва ; Краснодар : Лань : Планета музыки, 2018. - 128, [2] с.
2. Кофлер, Л. Искусство дыхания как основа звукоизвлечения : учеб. пособие / Лео Кофлер ; пер. с англ. Е. В. Вербицкой. - Санкт-Петербург ; Москва ; Краснодар : Лань : Планета музыки, 2019. - 319 с.
3. Сохор, А. Н. Музыка как вид искусства : учеб. пособие / А. Сохор. - 2-е изд., стер. - Санкт-Петербург ; Москва ; Краснодар : Планета музыки : Лань, 2018. - 124, [2] с.
4. Старикова, В. В. Оркестровая и ансамблевая литература : учеб. пособие для студентов учреждений высшего образования по специальности "народное творчество (по направлениям)" / В. В. Старикова. - Минск : БГУКИ, 2021. - 116 с.
5. Яконюк, Н. П. История и теория исполнительства на народных инструментах : учеб.-метод. комплекс / Н. П. Яконюк, О. А. Немцева. - Минск : БГУКИ, 2021. - 152 с.

## *Дадатковая літаратура*

1. Буданков, О.А. и др. Практический курс игры на русских народных духовых и ударных инструментах / Буданков О.А., Вахутинский М.Б., Петров В.К. – М.: Музыка, 1991. – 192 с., нот.
2. Гром, У.М, Крамко, А.Я., Мангушаў, І.А. Школа іґры на беларускіх народных духавых інструментах /У.М. Гром, А.Я. Крамко, И.А. Мангушаў: вучэб.-метад. дапам. – Мн.: Бел.дзяр. ун-т культуры і мастацтваў, 2005. – Ч. 1. Сольнае выкананне. – 259 с.
3. Гром, У.М., Крамко, А.Я., Мангушаў, І.А. Школа іґры на беларускіх народных духавых інструментах /У.М. Гром, А.Я. Крамко, И.А. Мангушаў: вучэб.-метад. дапам. – Мн.: Бел. дзяр. ун-т культуры і мастацтваў, 2005. – Ч. 2. Ансамблевае выкананне. – 217 с.
4. Гром, У., Галасы мінуўшчыны: зб. інструм.ансамбляў для бел.нар духавых інструментаў / У. Гром, А. Крамко, І. Мангушаў. – Мінск: Бел. ін-т культуры, 2003. –130 с.
5. Гром, У.М. Заіграйце, музыкі!: рэпертуарны зборнік для фальклорных калектываў: у 2-х ч. / У.М. Гром. – Мінск.: Чатыры чверці, 1998. – Ч. 2. – 155 с.
6. Гром, У.М., Дударэньку-гаспадэньку: рэпертуар. зб. для аматараў іґры на дудзе/ У.М. Гром; Бел ІПК – Мінск, 1999. – 54 с.

7. Коротеев, А.Л. Бытование амбушюрных духовых музыкальных инструментов в Беларуси (по материалам археологических изысканий, архивных исследований и анализа печатных изданий в контексте славянской органологии) / А.Л. Коротеев // Материалы IV Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры (Мінск, 24-26 мая 1999 г.). У 2 ч. Ч. 2 / ЕГУ, БУК; Рэдкал.: Пазнякоў А.У. (адк. рэд.) і інш. – Мн.:Бел. ун-т культуры, 1999. – С.168-176.
8. Коротеев, А.Л. Функциональные и этноорганологические особенности белорусских народных духовых инструментов/ А.Л. Коротеев // X Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры (Мінск, 24-26 мая 2004 г.) / Рэдкал.: М.А.Бяспалая (адк. Рэд.) і інш. – Мн.: Бел. дзярж. Ун-т культуры і мастацтваў, 2005. – С. 66-72.
9. Карацееў, А.Л. Неардынарная з'ява нацыянальна-выканальніцкага адраджэння / А.Л. Карацееў // Веснік БДУ культуры і мастацтваў. 2005, № 5. – С. 119-122.
10. Коротеев, А.Л. Мотивационные и аттестационно-квалификационные аспекты вузовской системы подготовки исполнителей на белорусских народных духовых музыкальных инструментах / А.Л. Коротеев // Высшая школа: проблемы и перспективы: Материалы 6-й Международной научно-методической конференции, Минск, 23-24 ноября 2004 г. – Мн.: РИВШ, 2004. – С. 165-166.
11. Коротеев, А.Л Фольклорные духовые инструменты белорусов в этнокультурном воспитании и художественном образовании детей и молодёжи (от музыкальной игрушки до разнообразия национального инструментария) / А.Л. Коротеев // “Этнашкола» ў сучасным адукацыйным працэсе: вопыт станаўлення і перспектывы развіцця (да 10-годдзя існавання) / Уклад. I навук. рэдакт. праф. І.І.Сучкоў. – Мн. : Бестпринт, 2004. – С- 87-94.
12. Крамко А. Я. Грай, мая дудка: вучэб. дапам./ А.Я. Крамко. – Мінск:, 2005. – 100 с.
13. Мангушаў І.А. Першапачатковая школа ігры на храматычнай дудцы: вучэб.-метад. дапам./ І.А. Мангушаў. – Мінск:, 2012. – 219 с.
14. Мангушаў І.А. Музычная скарбонка: вучэб. дапам./ І.А. Мангушаў. – Мінск:, 2005. – 88 с.
15. Назина, И.Д. Белорусские народные музыкальные инструменты: Самозвучащие, ударные, духовые / [Ред. М.Я.Гринблат]. – Мн.: Наука и техника, 1979. – 144 с., ил.
16. Назіна І.Д. Беларускія народныя музычныя інструменты. – Мн.: Беларусь, 1997. -239 с.

### *Метады і тэхналогіі навучання*

Выкладанне вучэбнай дысцыпліны "Спецінструмент" ажыццяўляецца з выкарыстаннем розных метадаў:

- тэарэтычных і агульналагічных (сістэматызацыі, класіфікацыі, параўнальнага аналізу, сінтэзу, абагульнення);
- эмпірычнага (назірання, апісанні, аналізу аўдыё- і відэаматэрыялаў, аналізу канцэртных праграм);
- тлумачальна-ілюстрацыйнага ў спалучэнні з рэпрадуктыўным.

На практычных занятках мэтазгодна прымяняць інтэрактыўныя метады навучання: работу з дыдактычнымі матэрыяламі, дыскусіі і абмеркаванні, разбор канкрэтных вучэбна-метадычных сітуацый, праектаванне навучальных заняткаў і г. д. Выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій навучання тэлекамунікацыйных сетак) дазволіць зрабіць аўдыторныя заняткі цікавейшымі і эфектыўнымі. Сярод форм ужывання кампутарных тэхналогій

– дэманстрацыя мультымедыйных прэзентацый, праслухоўванне і прагляд аўдыё- і відэаматэрыялаў, праца з рэсурсамі сеткі Інтэрнэт, электроннымі энцыклапедыямі і інш. Важным уяўляецца і ўлік міждысцыплінарных сувязяў. Пастаянны зварот да іншых тэарэтычных і практычных дысцыплін дазволіць растлумачыць навучальны матэрыял і замацаваць заняткі, якія засвойваюцца студэнтамі.

### *Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай працы студэнта*

Самастойная работа студэнтаў садзейнічае паглыбленню іх ведаў, пашырэнню кругагляду, фарміраванню навыкаў самастойнага пошуку і апрацоўкі інфармацыі, выпрацоўцы творчага падыходу да асваення тэарэтычнага і практычнага матэрыялу па тэмах вучэбнай дысцыпліны.

Самастойная работа студэнтаў у рамках вучэбнай дысцыпліны "Спецінструмент" уключае ў сябе наступныя формы:

- вывучэнне тэарэтычнага матэрыялу навучальнай дысцыпліны;
- выкарыстанне відэа-і аўдыёматэрыялаў;
- падрыхтоўка да практычных заняткаў і іспыту.

Вывучэнне матэрыялу навучальнай дысцыпліны мае на ўвазе працу студэнтаў з друкаванай літаратурай і рознымі інфармацыйнымі рэсурсамі сеткі Інтэрнет. Вывучэнне дадатковых матэрыялаў па індывідуальным спісе (з улікам базавай адукацыі).

Выкарыстанне відэа- і аўдыёматэрыялаў – адна з важных форм самастойнай працы ў рамках навучальнай дысцыпліны "Спецінструмент". Яно заключаецца ў пошуку, праглядзе, праслухоўванні і аналізе выступленняў розных калектываў і майстар-класаў вядомых выканаўцаў і педагогаў-духавікоў.

Падрыхтоўка да практычных заняткаў і іспыту патрабуе адказных адносін і рэгулярнай працы над замацаваннем ведаў, атрыманых падчас аўдыторных заняткаў, творчага падыходу (выкананне практычных заданняў

пры падрыхтоўцы), а таксама глыбокага вывучэння студэнтамі рэкамендаванай асноўнай і дадатковай літаратуры. У працэсе самастойнай працы студэнт падбірае нотныя прыклады (якія дазваляюць праілюстраваць асаблівасці выканальніцкай тэхнікі, спецыфікі трактоўкі і інтэрпрэтацыі твораў для духавых інструментаў), практыкаванні для правільнай пастаноўкі дыхання, сістэматызуе спосабы працы над інструктыўным матэрыялам, падбірае практыкаванні для развіцця тэхнікі пальцаў (як у працэсе самастойнага разбору, так і з ансамблевым калектывам).

Карыстанне нотным матэрыялам для студэнтаў абавязковае не толькі падчас самастойнай працы на інструментах, а так сама пры праслухоўванні музыкі.

### *Рэкамендуемыя сродкі дыягностыкі*

Для кантролю і самакантролю ведаў студэнтаў выкарыстоўваецца наступны дыягнастычны інструментарый:

- вуснае апытанне падчас заняткаў;
- выступленне студэнтаў на акадэмічных канцэртах, заліках, іспытах;
- творчыя заданні (падрыхтоўка прэзентацый па асобных раздзелах дысцыпліны; падбор ілюстрацыйнага матэрыялу);
- выкананне практычных заданняў (падбор музычнага матэрыялу па асобных тэмах дысцыпліны; паказ практыкаванняў для развіцця выканальніцкага дыхання, тэхнікі пальцаў, гнуткасці і рухомасці амбушура; падбор рэпертуару; складанне канцэртных праграм і г. д.);